# Прамова тав. Н. Ф. Гікало

## на Ўсебеларускім народным мітынгу 11 ліпеня 1936

Таварышы рабочыя, калгаснікі, совецкая працоўная інтэлігенцыя, сыны і дочкі беларускага народу!

Тысячагадовая гісторыя беларускага народу запоўнена крывавымі старонкамі прыгнёту і падняволення. З агнём і мячом праходзілі беларускую зямлю орды татар, літоўскія князі разам з беларускімі князямі прыгняталі беларускі народ, польскія магнаты, паны і шляхта паланілі, крыжом і мячом насаджвалі каталіцтва і польскія парадкі... Нават лівонскія і тэўтонскія рыцары і мечаносцы таптали зямлю беларускую. І якіх толькі полчышчаў прыгнятальнікаў не бачыла беларуская зямля!

І правільна выказана ў пісьме беларускага народу вялікаму Сталіну:

«Ішоў год за годам, ішоў век за векам,
А мы пад няволяй, пад вечыстым здзекам.
Паны і жандары, ды ксяндзы з папамі
На шыях народных селі груганамі».

І турмы, і катаргу, і бізун царскага самаўладства паспытаў беларускі народ, але асабліва свежа ў памяці беларускага народу белапольская акупацыя, як чорная здань бясправўя, пажараў, пагромаў, слёз і крыві ўдоў і дзяцей, закатаваных дзесяткаў і соцень байцоў беларусаў, яўрэяў за справу совецкай улады.

Шляхаводнай зоркай для беларускага народу стаў вялікі пролетарскі соцыялістычны Кастрычнік.

Стаўшы цвёрда на шлях ажыццяўлення ўказанняў **Леніна—Сталіна,** беларускі народ з брацкай дапамогай вялікага рускага народу і гераічнай Чырвонай арміі разбіў ланцугі акупацыі і бадзёра і смела ў сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза пачаў будаваць новае радаснае жыццё.

І сёння ў пісьме да вялікага **Сталіна** беларускі народ пяе і славіць шлях, пройдзены ім, шлях творчай будоўлі справы соцыялізма, стварэння і росквіту культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

За гэтыя кароткія гады сваёй новай совецкай гісторыі беларускі народ упісаў цудоўныя старонкі ў гісторыю барацьбы за справу соцыялізма, за справу комунізма.

Іменна дзякуючы кіраўніцтву партыі большэвікоў, дзякуючы штодзенным любоўным адносінам і дапамозе беларускаму народу мудрага і вялікага таварыша Сталіна, беларускі народ, не гледзячы на тысячагадовы гнёт мінулага, паказвае надзвычайныя якасці народу працавітага, народу інтэрнацыянальнага, які на аснове вялікай дружбы народаў у сям'і народаў Совецкага Саюза заняў пачэснае месца. Совецкая Беларусь стала ордэнаноснай рэспублікай.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі, створаная, выхаваная таварышам **Сталіным**, у радах сваіх меўшая вучняў **Леніна—Сталіна** тт. **Фрунзе, Мяснікова, Кагановіча, Ежова**, на справе праводзіць ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, на справе вырошчвае, прасоўвае і любоўна выхоўвае кадры партыйных і непартыйных большэвікоў з радоў беларускага народу.

Прыклад гэтаму—беларусы—кіраўнікі партыйнага, гаспадарчага, дзяржаўнага жыцця Совецкай Беларусі. Прыклад гэтаму—ордэнаносцы Беларусі. Прыклад гэтаму і паэты, якія так цёпла і прыгожа напісалі песню-паэму вялікаму **Сталіну** ад народу беларускага.

Беларускі народ можа запэўніць народы вялікіга Совецкага Саюза, ВКП(б), саюзны совецкі ўрад: тт. Молатава, Калініна, першага маршала Варашылава і вялікага **Сталіна**, што ён не дапусціць, каб совецкія граніцы на Захадзе пераступіла нага ворага.

Беларускі народ ганарыцца поспехамі сваёй соцыялістычнай будоўлі, росквітам сваёй культуры, але беларускі народ ведае, што зазнавацца нельга і што тут, на мяжы з Захадам, у асаблівасці трэба быць празорлівым, пільным, трэба ўмець бачыць і трэба ўмець знішчаць ворага.

Народ беларускі ведае, што за рубяжом частка беларускага народу і іншыя народы капіталістычных дзяржаў да сёнешняга дня скованы ланцугамі рабства, церпяць уціск, беспрацоўе, голад.

І памятаючы тысячагадовую гісторыю свайго мінулага і маладую гісторыю радаснага соцыялістычнага цяперашняга, беларускі народ натхняецца на новыя поспехі і барацьбу, натхняецца вялікай сталінскай Канстытуцыяй.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы